## *Віншуем юбіляра*

***Фальклорны калектыў «Мілавіца» – кіраўнік Марыя Снітко, яе памочнікі: акампаніятар Алесь Булойчык, Надзея Касцяневіч, Вераніка Анцілеўская – і ўсе ўдзельнікі (а іх, дарэчы, больш за 70 чалавек) віншуюць шчодрага душой, таленавітага, сэрцам адданага танцавальнай творчасці беларускага народа дзеяча нацыянальнай культуры Міколу Козенку з днём нараджэння. Яны даслалі ў рэдакцыю ліст, які мы з радасцю сёння друкуем.***

Ужо больш за тры гады Мікалай Аляксеевіч перадае сваё майстэрства: ладзіць заняткі па харэаграфіі ў фальклорным калектыве «Мілавіца», у складзе якога і самыя маленькія дзеткі, і падлеткі, а таксама юнакі і дзяўчаты, іх бацькі і нават бабулі і дзядулі. Розны ўзрост і немалая колькасць удзельнікаў «Мілавіцы» нагадвае вялікую вёску, дзе ўсе адно аднаго добра ведаюць. Гэты асяродак з'явіўся добрай глебай, на якой Мікалай Аляксеевіч праз танец узрошчвае пачуцці аб'яднання і павагі да тых, хто побач, робіць іх натуральнымі асновамі жыцця для кожнага. Праз злучаныя рукі ў танцах аб'ядноўваюцца нашыя сэрцы моцнымі і трывалымі сувязямі, каб назаўжды зрабіць нас сапраўднымі сябрамі.

Яднальную сутнасць беларускага танца мы адчуваем кожны раз, калі збіраемся на занятках, і гэтае пачуццё застаецца з намі, як каштоўны падарунак, тым даражэйшы, чым больш складаныя выпрабаванні прапаноўвае час нашага існавання. Лірычнасць і хараство рухаў складаюцца ў арнаменты і замалёўкі, якія не надакучвае кожны раз «разглядаць» пад час заняткаў. Толькі на ўласным досведзе можна спасцігнуць эмацыйны пад'ём і бадзёрасць, якія адчуваеш пасля харэаграфічных сустрэчаў.



*Фальклорны калектыў «Мілавіца» і М. Козенка (стаіць трэці справа)*

Педагагічнае майстэрства найвышэйшага кшталту ператварае заняткі ў неверагодную дзею, калі на нашых вачах і з нашым удзелам адбываецца вандроўка па прасторах часу. Мы адкрываем для сябе зносіны, адчуванні, уласцівыя нашым продкам, – спадзяванні народа, яго ўспрыманне сусвету, надзеі, лад жыцця – усё, што ўвасабляецца ў рухах народнага танца. Гэты скарб карпатліва збірае і шчодра перадае нам Мікалай Аляксеевіч – этнахарэограф, педагог, аўтар праекта і мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2014).

За непаўторныя моманты, за незабыўныя пачуцці мы дзякуем нашаму маэстра нацыянальнай харэаграфіі, зычым яму моцнага здароўя, дабрабыту, увасаблення задумаў і мар.

***З Днём народзінаў, шаноўны наш Мікалай Аляксеевіч!***

*Удзельнікі калектыву «Мілавіца»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ